85.03 (4 Бел)
П 99

Д87

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

УДК 7.03 (476 „15/16" (043.3))

Пярсідская
Юлія Дзмітрыеўна

# МАСТАЦКАЕ ЖЫЦЦЁ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ XVI – XVII стст. (МАСТАЦТВАЗНАЎЧАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ)

Репозиторий БГУКИ

Аўтарэферат дысертацыі
на суіскание вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства

па спецыяльнасці 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтва

Мінск 2007

Работа выканана на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

Навуковы кіраўнік – **Голікава Ларыса Фёдараўна,**
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,
загадчык кафедры тэатральнай творчасці
УА "Беларускі дзяржаўны
універсітэт культуры і мастацтваў"

Афіцыйныя апаненты – **Дадзіёмава Вольга Уладзіміраўна,**
доктар мастацтвазнаўства, прафесар,
загадчык кафедры беларускай музыкі
УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі"

**Барвенава Ганна Аляксандраўна,**
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт
кафедры рэжысуры абрадаў і свят
УА "Беларускі дзяржаўны
універсітэт культуры і мастацтваў"

Апаніруючая арганізацыя – **УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"**

Абарона адбудзецца 17 студзеня 2008 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" па адрасу: 220007, Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі; e-mail: bguki_IC@tut.by; тэл. вучонага сакратара 222-83-36.

З ... яржаўны універсіт...

Вучоны ...
савета п...
кандыда... ова
дацэнт

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Павышэнне ўвагі да нацыянальнай спадчыны Беларусі вызвана ростам самасвядомасці беларускага грамадства, жаданнем ведаць гісторыю культуры нашай краіны і ўшаноўваць яе самабытныя нацыянальныя традыцыі. Важнае месца ў айчыннай гісторыі займае перыяд XVI – XVII стст., паколькі менавіта на гэтым этапе закладваліся перадумовы для культурнага "усплёску" ў наступным – XVIII – стагоддзі. У дысертацыі ўпершыню комплексна даследуецца мастацкае жыццё прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадоў Беларусі адзначанага перыяду, выяўляецца характар і асаблівасці яго бытавання на аснове новага фактычнага матэрыялу, знойдзенага аўтарам у архівах Польшчы, Украіны, Беларусі і ўведзенага ў навуковы ўжытак, адзначаецца месца мастацкага жыцця гарадоў Беларусі ў айчынным гісторыка-культурным працэсе XVI – XVII стст., што і вызначае ***актуальнасць*** дысертацыйнага даследавання.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Работа выконвалася ў межах наступных комлексных навуковых даследаванняў, якія праводзіліся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў: "Гісторыя мастацкай культуры Беларусі ад вытокаў да сучаснасці" (тэма зацверджана на пасяджэнні Савета Беларускага універсітэта культуры 19. 03. 1996 г.) кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры; "Сучасны беларускі тэатр: праблемы развіцця" (Раздзел 1.1 "Станаўленне тэатральнай культуры ў Беларусі") і "Тэатральнае мастацтва Беларусі: гістарычны, тэарэтычны і педагагічны аспекты" (тэмы зацверджаны на пасяджэннях Савета БДУ культуры і мастацтваў 20. 02. 2001 г., пратакол №6; 21.03. 2006 г., пратакол №7) кафедры тэатральнай творчасці; "Гісторыка-культурная спадчына Беларусі: праблемы захавання" (тэма зацверджана на пасяджэннях Савета БДУ культуры і мастацтваў 21. 03. 2006 г., пратакол №7) кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства.

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта дысертацыйнага даследавання – рэканструяваць панараму мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст., фарміраванне і дынаміка развіцця якога абумовілі роскві айчыннай мастацкай культуры ў наступным – XVIII стагоддзі.

Дзеля дасягнення мэты ставяцца пэўныя задачы:

– выявіць і ўвесці ў навуковы ўжытак новыя факты і звесткі, знойдзеныя ў архівах Польшчы, Украіны, Беларусі, аб характары і ўмовах бытавання мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст., якое развівалася ў цеснай сувязі з існуючым палітычным, грамадска-сацыяльным і рэлігійным укладам жыцця дзяржавы;

– раскрыць дынаміку развіцця відаў мастацкага жыцця ў прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадах Беларусі XVI – XVII стст. у адпаведнасці з уплывам на яго

Інв. № 614



Репозиторий БГУКИ

(мастацкае жыццё) знешніх (ваенная сітуацыя ў краіне) і ўнутраных (секулярызацыя мастацтва) фактараў;

– выявіць асаблівасці мастацкага жыцця ў гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. абодвух тыпаў у залежнасці ад дамінавання ў ім (мастацкага жыцця) розных форм;

– вызначыць ролю прадстаўнікоў гарадскіх саслоўяў (магнатэрыі, духавенства, рамеснікаў, мяшчан) і дэмаграфічнай групы навучэнцаў у распаўсюджанні і ўвасабленні заходнееўрапейскіх і ўмацаванні мясцовых традыцый у мастацкім жыцці гарадоў Беларусі XVI – XVII стст.; а таксама асобных беларусаў у станаўленні мастацкай культуры Расіі (XVII ст.);

– ахарактарызаваць мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. як пэўную культурную з'яву канкрэтнага гістарычнага перыяду і вызначыць яго (мастацкага жыцця) месца ў айчынным гісторыка-культурным працэсе.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

Аб'ект даследавання – мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. Прадмет даследавання – характар, віды, формы і асаблівасці бытавання мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст.

Выбар аб'екта і прадмета даследавання абумоўлены новым падыходам да гісторыка-культурнай з'явы – мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVI – XVII стст., якое прадстае як канкрэтна-гістарычнае быццё мастацкай культуры ў яе агульнагарадскім, рэпрэзентатыўным, уласна-побытавым відах і ва ўзаемасувязях мастацкіх форм (тэатральных, музычных, мастацкіх).

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. Характар мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст.:

– быў абумоўлены тыпам горада (прыватнаўласніцкі ці каралеўскі), месцам яго знаходжання (гандлёвы, памежны), а таксама залежаў ад грамадска-палітычнага, сацыяльнага і рэлігійнага ўкладу жыцця ў краіне;

– вызначаўся ўмовамі бытавання і відамі (мастацкага жыцця) – агульнагарадскім (рэлігійныя і свецкія ўрачыстасці), рэпрэзентатыўным (ваенныя парады, пахавальныя цырымоніі), уласна-побытавым (асабісты дасуг);

– праяўляўся ў розных яго формах – тэатральных, музычных, мастацкіх.

2. Мастацкае жыццё беларускага грамадства як адзіны мастацка-культурны працэс у XVI – XVII стст. фарміравалася пад уздзеяннем знешніх (грамадска-палітычных) і ўнутраных (секулярызацыйных) фактараў, якія ўскосна (але непазбежна) паўплывалі на дынаміку яго (мастацкага жыцця) развіцця. На працягу двухсотлетняга перыяду мастацкае жыццё ўсіх саслоўяў у гарадах абодвух тыпаў развівалася як калектыўнае (агульнагарадское і рэпрэзентатыўнае) і індывідуальнае (уласна-побытавае); на пэўных этапах змянялася і ўзбагачалася новымі формамі.

3. Асаблівасці мастацкага жыцця ў гарадах Беларусі абодвух тыпаў праяўляліся ў залежнасці ад распаўсюджанасці пэўнага яго (мастацкага жыцця) віда ці пераважаннем у ім адной з форм (тэатральных, музычных, мастацкіх).



4. Роля кожнага з саслоўяў вызначалася ступенню іх удзелу ў мастацкім жыцці гарадоў абодвух тыпаў. Саслоўныя (магнатэрыя, духавенства, купцы, рамеснікі, мяшчане) і дэмаграфічная (навучэнцы) групы выконвалі адпаведныя функцыі (арганізатараў, удзельнікаў, выканаўцаў, гледачоў) у калектыўных (агульнагарадскіх і рэпрэзентатыўных) мерапрыемствах; прадстаўнікі духавенства і навучэнцы садзейнічалі ўзбагачэнню розных відаў мастацкага жыцця. Выхадцы з Беларусі адыгралі важную ролю ў станаўленні і развіцці мастацкай культуры Расійскай дзяржавы ў XVII ст.

5. Мастацкае жыццё прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадоў Беларусі перыяду XVI – XVII стст. можна прадставіць як пэўную культурную з'яву. У гэты перыяд упершыню з'явіўся прыватнаўласніцкі тэатр (аб чым сведчаць дзённікі Г.Вольфа, С.Незабітоўскага); сфарміраваліся пэўныя каноны музычнага выканальніцтва; закладваліся асновы для ўзнікнення музейных збораў і калекцый; усталявалася пэўная мадэль правядзення агульнагарадскіх і рэпрэзентатыўных цырымоній, якія сталі асновай для пышных урачыстасцей у наступным стагоддзі; развівалася прафесійная мастацкая школа; распаўсюдзілася мецэнацтва. Менавіта на гэтым этапе закладваліся перадумовы для "усплёску" айчыннай культуры, якім адзначана XVIII ст.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыя з'яўляецца вынікам асабістых навуковых даследаванняў аўтара. Суіскальнікам знойдзены новыя матэрыялы і дакументы ў архівах і бібліятэках Беларусі, Украіны, Польшчы, выяўлены і перакладзены з лацінскай, польскай, англельскай моў рукапісы, старадрукі.

Упершыню ў айчынным мастацтвазнаўстве:

- зроблена мастацтвазнаўчая рэканструкцыя мастацкага жыцця прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. у адпаведнасці з існуючай у іх саслоўнай іерархіяй;
- адзначаны ўклад кожнага з саслоўяў у эвалюцыю розных відаў і форм мастацкага жыцця на тэрыторыі Беларусі ў XVI – XVII стст.;
- удакладнена дынаміка яго развіцця ў залежнасці ад знешніх (ваенная сітуацыя ў краіне) і ўнутраных (секулярызацыя мастацтва) фактараў;
- выяўлены ўплыў заходнееўрапейскіх і мясцовых культурных традыцый на характар мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст.;
- вызначана месца мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. у айчынным гісторыка-культурным працэсе.

Знойдзеныя аўтарам архіўныя даныя (архіў Радзівілаў у Варшаве) даюць падставу сцвярджаць, што першыя прафесійныя прыватнаўласніцкія тэатры з'явіліся на Беларусі яшчэ ў апошняй трэці XVI ст. (да распаўсюджання школьнага тэатра) і складаліся з труп замежных (італьянскіх) акцёраў. На працягу перыяду канца XVI – XVII стст. фарміраваўся рэпертуар, ускладняліся, у адпаведнасці з тэндэнцыямі



Репозиторий БГУКИ

заходнееўрапейскага барока, тэатральныя формы. Выяўленыя архіўныя крыніцы дазволілі зрабіць выснову аб усталяванні розных манер выканання музычных твораў прафесійнымі калектывамі розных канфесій, а таксама аб характары мастацкіх збораў і калекцый, якія фарміраваліся прадстаўнікамі заможных саслоўяў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Высновы даследавання на розных яго этапах былі апрабіраваны на наступных 7 міжнародных, 2 рэспубліканскіх, 7 вузаўскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, навуковых чытаннях: XXIX навуковай канферэнцыі "Нацыянальная спадчына і сучасныя праблемы культуры (прысвечанай 60-годдзю вызвалення Беларусі)" – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, 22 – 23 красавіка 2004 г.; навуковай канферэнцыі "Духоўная культура Беларусі: спадчына і сучаснасць" – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, 24 – 25 лістапада 2004 г.; XXX навуковай канферэнцыі "Каштоўнасці нацыянальнай культуры і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі" (прысвечанай 60-годдзю вызвалення Беларусі) – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, 20 – 21 красавіка 2005 г.; навуковай канферэнцыі, прысвечанай 30-годдзю БДУ культуры і мастацтваў "Культура і творчасць: сучасны стан і перспектывы" – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, 13 кастрычніка 2005 г.; XXXI навукова-практычнай канферэнцыі – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, 21 красавіка 2006 г.; X Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, 25 сакавіка 2004 г.; XI Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, 24 мая 2005 г.; II Няфёдаўскіх чытаннях – Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Мінск, 24 – 25 сакавіка 2005 г.; XII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, 25 – 26 мая 2006 г.; XIII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, 24 – 26 мая 2007 г.; международной научно-практической конференции молодых исследователей «Содружество наук» – БарГУ, Баранавічы, 22 февраля 2005 г.; международной научно-практической конференции студентов и молодых учёных "Социально-психологические и гуманитарные аспекты интеграции культур в условиях трансформации современного общества" – ВГУ ім. П.М. Машэрава, Віцебск, 10 лістапада 2005 г.; рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Сучаснае беларускае мастацтва і нацыянальная мастацкая школа: праблемы захавання самабытнасці і далейшага развіцця" – Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Мінск, 14 лістапада 2005 г.; міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Актуальныя праблемы сучаснай



культуры" – НАН Беларусі, Ін-т маст-ва, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы, Мінск, 18 кастрычніка 2006 г.; XXVIII навуковай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага складу БДУКіМ – Мінск, 23 – 24 лістапада 2006 г.; XXIX навуковай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага складу – БДУКіМ – Мінск, 28 – 29 лістапада 2007 г.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі адлюстраваны ў 16 публікацыях: 3 артыкулах у навуковых рэцэнзаваных часопісах (1,2 а.л.), 3 артыкулах у навуковых зборніках, 7 матэрыялах навуковых канферэнцый, 3 тэзісах дакладаў навуковых канферэнцый. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 3 аўтарскіх ліста.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі займае 180 старонак, з іх 102 старонкі – асноўны тэкст, 21 старонка – бібліяграфічны спіс, які ўключае 265 крыніц на беларускай, рускай, лацінскай, ангельскай, польскай мовах, у тым ліку 16 крыніц – публікацыі аўтара, 57 старонак займаюць дадаткі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваюцца выбар тэмы даследавання, яго актуальнасць, мэта і задачы. Вызначаны аб'ект і прадмет даследавання, сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі. Прадстаўлены асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, асабісты ўклад суіскальніка. Адлюстраваны звесткі аб апрабацыі і апублікаванасці вынікаў дысертацыі, яе структура і аб'ём.

**Першая глава "Метадалагічна-тэарэтычныя асновы даследавання"** прысвечана аналізу навуковых прац, у якіх разглядаецца развіццё розных відаў мастацтва на тэрыторыі Беларусі XVI – XVII стст., а таксама абгрунтоўваецца выкарыстанне ў дысертацыйным даследаванні адпаведных навуковых падыходаў і метадаў.

***У раздзеле 1.1"Аналітычны агляд літаратуры і рукапісаў"*** аналізуюцца навуковыя даследаванні па гісторыі станаўлення і развіцця на тэрыторыі Беларусі прафесійнага тэатральнага мастацтва (К.Вайціцкага, А.Весялоўскага, Я.Леваньскага, А.Мальдзіса, С.Міско, Я.Оканя, В.Ператца, В.Разанава, Л.Сафронавай, Я.Усікава), музычнага мастацтва (В.Дадзіёмавай, Л.Касцюкавец, Т.Ліхач, У.Неўдаха), выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (Н.Высоцкай, М.Кацара, Б.Лазукі, Л.Тананаевай, А.Хадыкі, Ю.Хадыкі, В.Церашчатавай, М.Шчакаціхіна), беларускай архітэктуры (А.Лакоткі, М.Ткачова, А.Трусава), мастацкай адукацыі (М.Балінскага, К.Харламповіча, В.Пракапцовай), у якіх навукоўцамі разглядаліся асобныя з'явы,



Репозиторий БГУКИ

характэрныя для мастацтва Беларусі XVI – XVII стст. Згодна з прааналізаванымі навуковымі працамі вылучаюцца наступныя пытанні, не закранутыя ў даследаваннях вышэйадзначаных навукоўцаў: вызначэнне ролі кожнай з саслоўных груп беларускіх гараджан у станаўленні мастацкага жыцця на беларускіх землях XVI – XVII стст.; удакладненне яго характару і асаблівасцей развіцця ў прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадах Беларусі XVI – XVII стст. у залежнасці ад існуючага палітычнага, эканамічнага і рэлігійнага ўкладу жыцця дзяржавы; выяўленне ўплыву мясцовых і заходнееўрапейскіх традыцый на характар мастацкага жыцця ў гарадах Беларусі адзначанага перыяду.

Важным этапам у правядзенні дысертацыйнага даследавання з'явілася пашырэнне яго крыніцазнаўчай базы. Пошук новага фактычнага матэрыялу ажыццяўляўся ў дзяржаўных архівах і бібліятэках Беларусі, Украіны і Польшчы. На падставе прааналізаваных архіўных актаў, гісторыка-юрыдычных матэрыялаў, археалагічных зборнікаў дакументаў, метрык, хронік гарадоў, штогодных справаздачных запісаў калегіумаў, рукапісных зборнікаў панегірыкаў і камедый (асабіста знойдзеных аўтарам), дзённікаў Г.Вольфа (XVI ст.), Дж.Гарзэя (XVI ст.), А.Скарабагатага (сяр. XVII ст.), С.Незабітоўскага (сяр. XVII ст.), Радзівіла (сяр. XVII ст.) выяўлены характар і асаблівасці мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст., адзначана яго месца ў айчынным гісторыка-культурным працэсе.

***У раздзеле 1.2 "Метадалагічная база даследавання"*** абгрунтоўваюцца асноўныя навуковыя падыходы і метады для вырашэння пастаўленых у дысертацыі задач: комплексны, сацыялагічны, культуралагічны, сістэмны падыходы; параўнальны аналіз, сінтэз, абагульненне, мастацка-аналітычны і параўнальна-гістарычны метады, а таксама універсальны прынцып гістарызму.

**У другой главе "Фарміраванне мастацкага асяроддзя ў гарадах Беларусі ад вытокаў да канца XVII ст.: гістарыяграфічны аспект"** разглядаюцца этапы станаўлення мастацкага жыцця гарадоў Беларусі, што звязана з дзейнасцю прадстаўнікоў духоўнай і свецкай саслоўнай эліты, а таксама са старажытнымі мясцовымі традыцыямі. Вызначаюцца і характэрныя рысы мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст., а таксама аналізуюцца ўмовы яго існавання, якія змяняліся ў залежнасці ад пэўнай дзяржаўнай, грамадска-палітычнай, рэлігійнай, сацыяльнай і інш. сітуацый.

***Раздзел 2.1 "Перадумовы ўзнікнення і характэрныя рысы мастацкага жыцця гарадоў Беларусі да XVI ст."*** прысвечаны аналізу станаўлення мастацкага жыцця гарадоў Беларусі (XI – XV стст.), што існавала пад уплывам царкоўнай ідэалогіі: на тэрыторыі Беларусі (Тураў, Полацк) узводзіліся буйныя храмы, якія з таго часу сталі асноўнымі гарадскімі цэнтрамі развіцця мастацкага жыцця і ў межах якіх развівалася музычнае (пісьмовай традыцыі) і выяўленчае мастацтва, падпарадкаванае ў адзначаны перыяд богаслужэбным канонам, рытуалам. У гэты час закладваюцца першыя традыцыі арганізацыі афіцыйных гарадскіх цырымоній (як



царкоўных, так і свецкіх). Асабліва былі распаўсюджаны на беларускіх землях шэсці, якія сфарміраваліся яшчэ з часоў прыняцця хрысціянскай рэлігіі і да пачатку XVI ст. усталявалася пэўная мадэль іх правядзення (складалася з афіцыйнай і забаўляльнай частак). У сценах вялікакняжацкіх палацаў і цэркваў фарміруюцца першыя прафесійныя харавыя капэлы (свецкія капэлы Альдоны, Вітаўта, хор у Тураўскай царкве), з пачатку XV ст. прадстаўнікі каталіцкага духавенства пачынаюць уводзіць у богаслужэнне элементы тэатралізацыі (імітуючы біблейскія падзеі), мастацкага афармлення (да святаў упрыгожвалі храм). У мастацкім жыцці непрывілеграванага саслоўя панавалі формы сумесных святкаванняў, звязаныя з традыцыямі народнай святочна-абрадавай культуры. Пасля адпраўлення ўрачыстай службы ў царкве гараджане арганізоўвалі на вуліцах святочныя гулянні, якія суправаджаліся ігравымі сцэнамі, прадстаўленнямі з удзелам язычніцкіх персанажаў (Каляды ў Тураве, Пінску).

***У раздзеле 2.2 "Умовы развіцця мастацкага жыцця гарадоў Беларусі ў XVI – XVII стст."*** аналізуецца характар мастацкага жыцця гарадоў Беларусі абодвух тыпаў, фарміраванне і эвалюцыя якога праходзіла пад уздзеяннем шэрагу фактараў – дзяржаўнага (стварэнне Рэчы Паспалітай), рэлігійнага (суіснаванне ў межах адной дзяржавы некалькіх канфесій – праваслаўя, каталіцызму, пратэстантызму, уніяцтва, іудаізму, ісламу), саслоўнага, духоўна-культурнага (распаўсюджанне гуманістычных ідэй на беларускіх землях садзейнічала павелічэнню колькасці адукаваных гараджан, станаўленню айчыннай адукацыйнай сістэмы).

Канфесійная і саслоўная неаднароднасць грамадства супадала з "падзелам" моўным. З XVII ст. сярод вышэйшых слаёў грамадства назіраецца "пераарыентацыя" на заходнехрысціянскія канфесіі, адыход ад выкарыстання старабеларускай мовы (перш за ўсё ў паўсядзённым жыцці) і ўжыванне заходніх моў (у прыватнасці польскай, нямецкай, французскай, лацінскай). Прадстаўнікі мяшчанскага саслоўя прытрымліваюцца старажытных традыцый у рэлігіі (праваслаўнай) і мове (старажытнабеларускай), з'яўляюцца іх асноўнымі носьбітамі.

У мастацкім жыцці гарадоў Беларусі тагачаснага перыяду адлюстроўваюцца змены і працэсы, што адбываліся па ўсёй краіне (аб'яднанне Вялікага княства Літоўскага з Каронай Польскай; дзейнасць езуіцкага ордэна, пратэстантаў; царкоўная унія 1596 г.). Асабліва яскрава гэта праяўлялася ў буйных прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадах, менш – у невялікіх гарадах абодвух тыпаў. Ужо к XVI ст. асноўныя праблемы, што выявіліся паралельна з урбанізацыяй (рэгуляванне адносін сярод гараджан, рэгламентацыя іх удзелу ў арганізацыі і правядзенні агульнагарадскіх, рэпрэзентатыўных урачыстасцей і г.д.), абумовілі з'яўленне пэўных зводаў законаў (цэхавых статутаў), якія ўсталёўвалі правілы паводзінаў падчас калектыўных мерапрыемстваў, адзіныя для розных сацыяльных груп. У гэты перыяд у гарадах абодвух тыпаў дзейнічала традыцыя правядзення магнатэрыяй і гарадскімі



Рэпазіторый БДУКіМ

ўладамі ўрачыстых шэсцяў, якія аб'ядноўвалі гараджан, збіралі разам прадстаўнікоў розных канфесій, вызначалі месца прафесійных карпарацый на сацыяльнай лесвіцы.

**Трэцяя глава "Мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVI – XVII стст.: мастацтвазнаўчая рэтраспектыва"** прысвечана гісторыка-мастацтвазнаўчай рэканструкцыі цэласнай карціны мастацкага жыцця прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадоў Беларусі XVI – XVII стст., якое працякала пад уплывам як мясцовых, так і запазычаных (заходнееўрапейскіх) культурных традыцый; вызначэнню ролі кожнай з саслоўных груп у яго (мастацкага жыцця) развіцці. У сваю чаргу дзейнасць беларускай дыяспары адыграла значную ролю ў станаўленні мастацкай культуры Расіі (XVII ст.).

***У раздзеле 3.1 "Характар мастацкага жыцця гарадоў Беларусі і яго асаблівасці"*** аналізуецца мастацкае жыццё ў дынаміцы яго развіцця на працягу XVI – XVII стст., якое залежала ад тыпу горада – прыватнаўласніцкага (Нясвіж, Слуцк, Шклоў) ці каралеўскага (Пінск, Полацк) падпарадкавання, яго геапалітычнага месцазнаходжання – памежны (Орша) ці гандлёвы (Віцебск, Брэст), вызначалася ўмовамі бытавання мастацкага жыцця, яго відамі – агульнагарадскім, рэпрэзентатыўным, уласна-побытавым, і формамі – тэатральнымі, музычнымі, мастацкімі.

*3.1.1 "Агульнагарадскі від мастацкага жыцця"* складаўся з калектыўных мерапрыемстваў – рэлігійных (Раство Хрыстова, Пасха) і свецкіх (прывітальныя сустрэчы паважаных асоб), у якіх прымалі ўдзел усе жыхары горада. З пачатку XVI ст. святкаванне цырымоній у гарадах абодвух тыпаў адбывалася ў адпаведнасці са старажытнымі традыцыямі: духавенства арганізоўвала ўрачыстыя шэсці, у якіх крочылі ў рэгламентаваным парадку гараджане ўсіх саслоўных груп. Потым адпраўлялася святочнае богаслужэнне, у якім значнае месца займала музыка. Кульмінацыйныя моманты мерапрыемства суправаджаліся выбухамі гармат, звонам званоў ва ўсіх цэрквах і касцёлах горада. Свецкія цырымоніі адбываліся па сцэнарыю рэлігійных урачыстасцей.

З сярэдзіны XVI ст. у характары мастацкага жыцця абодвух тыпаў гарадоў адбываюцца пэўныя змены: у гарадах каралеўскага падпарадкавання агульнагарадскія ўрачыстасці праходзяць абавязкова з удзелам касцёльнай капэлы ці праваслаўнага хора, у прыватнаўласніцкіх гарадах у мерапрыемствах разам з царкоўнай удзельнічае яшчэ і свецкая капэла магната, караля, што выконвае творы мясцовых кампазітараў (напрыклад, Вацлава з Шамотул, К.Клабана). Святочныя набажэнствы падчас урачыстасцей, якія праводзіць праваслаўная канфесія ў гарадах абодвух тыпаў, узбагачаюцца гучаннем новых эмацыянальна-выразных партэсных спеваў.

З канца XVI ст. у прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадах (перш за ўсё ў сталіцы ВКЛ), дзе пачынае весці актыўную дзейнасць ордэн езуітаў, агульнагарадскія мерапрыемствы ператвараюцца ў пышныя касцюміраваныя паратэатральныя шэсці, характэрныя для заходнееўрапейскага барока; гарадская прастора аздабляецца



ўзвядзеннем трыумфальных арак з дэкаратыўнымі фігурамі святых, гербамі ВКЛ; шэсце суправаджаецца выкананнем (вакальным і інструментальным) духоўных гімнаў, прадстаўленнямі сіламі навучэнцаў (у касцёле) рэлігійных драм (касцюміраванае шэсце ў Вільні, 1586 г.; драма на Пасху ў Полацку, 1603 г.). У святочных набажэнствах (афіцыйнай часткі агульнагарадскіх цырымоній), якія праводзіць праваслаўная царква, распаўсюджваюцца тэатралізаваныя абрады ("амавенне ног", "хаджэнне на асляці").

У першай трэці XVII ст. (30 – 40 гг.) у гарадах абодвух тыпаў калектыўныя агульнагарадскія мерапрыемствы розных канфесій усё відавочней адрозніваюцца паміж сабой. У прыватнаўласніцкіх гарадах яны аздабляюцца панегірычнымі вершамі, складзенымі навучэнцамі ў гонар магната, на трыумфальных арках разам з гербамі езуіцкага ордэна размяшчаюцца родавыя гербы арыстакратыі, партрэты прадстаўнікоў магнацкага роду (цырымонія ў Нясвіжы, 1640 г.). У гарадах каралеўскага падпарадкавання зацвярджаюцца новыя правілы арганізацыі агульнагарадскіх шэсцяў, якія рэгламентуюць абавязковы ў іх удзел усіх гарадскіх прафесійных карпарацый і канфесійных аб'яднанняў згодна ўстаноўленаму парадку і з нязменнай атрыбутыкай: музычнымі інструментамі (барабанамі), сцягамі з эмблемамі, у асабістым святочным адзенні, з халоднай і агнястрэльнай зброяй (працэсія ў Оршы, 1636 г.). Дэкаратыўнае афармленне агульнагарадскіх цырымоній у каралеўскіх гарадах: брамы ўпрыгожваюцца іконамі ці парсунамі (у Магілёве сярэдзіны XVII ст. гэтую функцыю магістрат ускладваў на маляра Саўку), кілімамі, а таксама усталёўваюцца гарматамі (з 1640 па 1650 гг. у гарадах Беларусі адбылося 18 агульнагарадскіх цырымоній, што зафіксавана ў архіўных крыніцах). Аднак прыкладна з сярэдзіны 50-х па 70-я гг. XVII ст. агульнагарадское мастацкае жыццё ў гарадах Беларусі абодвух тыпаў амаль спыняецца ў сувязі з актыўнымі ваеннымі дзеяннямі (з 1657 па 1670 гг. адбылося такіх цырымоній усяго 6).

З апошняй трэці XVII ст. калектыўныя агульнагарадскія мерапрыемствы ізноў пачынаюць наладжвацца па ўсталяваных дагэтуль сцэнарыях (з 1671 па 1699 гг. праведзены 31 урачыстыя працэсіі). З гэтага часу відавочна ўзмацняюцца секулярызацыйныя працэсы ў мастацкім жыцці гарадоў каралеўскага падпарадкавання (раней яны паўплывалі на характар агульнагарадскога мастацкага жыцця прыватнаўласніцкіх гарадоў). У музычным аздабленні агульнагарадскіх цырымоній (рэлігійных і пазахрамавых) удзельнічаюць царкоўныя капэлы і хоры, рэпертуар якіх складаўся як з літургічных, так і з свецкіх музычных твораў (віленская капэла).

*3.1.2 "Рэпрэзентатыўны від мастацкага жыцця"* распаўсюджаны ў гарадах абодвух тыпаў, а таксама ў горадзе з рэзідэнцыяй караля (Гродна). Сярод асноўных форм рэпрэзентацыі ў прыватнаўласніцкіх гарадах можна вылучыць: урачыстыя шэсці (пешыя і конныя); дзяржаўныя рэпрэзентатыўныя цырымоніі-сустрэчы каралеўскіх гасцей, у якіх прымалі ўдзел выключна прадстаўнікі арыстакратычных



Репозиторий БГУКИ

родаў з асабістай харугвай і ваеннай музыкай (сустрэча каралевы Марыі Ганзага ў Варшаве, 1646 г.); пахавальныя шэсці магната-уладара ці членаў яго сям'і, што пераўтвараліся ў свайго роду жалобны тэатралізаваны спектакль, у якім дамінавала ваенная атрыбутыка, касцёл, дзе знаходзілася труна, багата дэкарыраваўся, галоўны акцёр (arhimimus) увасабляў "жывога" нябожчыка, а навучэнцы выконвалі духоўныя гімны, жалобныя канты, чыталі вершы-эпітафіі (пахаванне Крыштофа Радзівіла, 1640 г.); стралковыя спаборніцтвы на прыз "караля курка", што арганізоўвала для гараджан магнатэрыя звычайна падчас кірмашоў (спаборніцтвы, арганізаваныя Радзівіламі, Нясвіж, сяр. XVI ст.; Слуцк, 1621 г.). У каралеўскіх гарадах рэпрэзентатыўныя калектыўныя мерапрыемствы існавалі ў форме ваенных парадаў ваеннаабавязаных гараджан, што арганізоўваў магістрат, і стралковых збораў, якія, згодна са старажытнымі мясцовымі традыцыямі, праходзілі з абавязковым адпраўленнем богаслужэння, урачыстым шэсцем гараджан да месца правядзення збораў і трыумфальным вяртаннем назад, у горад. Галоўнымі ўдзельнікамі парадаў і збораў з'яўляліся рамесніцкія і купецкія карпарацыі гараджан (парад у Гомеле, другая палова XVII ст.).

*3.1.3 "Уласна-побытавы від мастацкага жыцця"* у гарадах абодвух тыпаў займаў важнае месца ў прыватным жыцці прадстаўнікоў розных саслоўных груп. Існуючыя яго (мастацкага жыцця) формы: індывідуальныя прыёмы ў магнатаў, членаў магістрата; балі ў арыстакратаў; прыватныя сяброўскія вечарыны ў мяшчан; хатняе бытавое музіцыраванне; калекцыяніраванне твораў дэкаратыўна-прыкладнога, выяўленчага мастацтва, экзатычных, антычных рэчаў і г.д. На працягу XVI – XVII стст. уласнае мастацкае жыццё гараджан усіх саслоўяў працякала даволі інтэнсіўна. Услед за магнатэрыяй, рэзідэнцыі якой аздабляліся лацінскімі выразамі ў гонар уладара палаца (у Нясвіжы – "Tempora mutantur et nos mutamur in illis" = "Час мяняецца, і мы мяняемся разам з ім", "Exitus acta probat" = "Вынік падцвярджае дзейнасць") і дзе падчас прыватных баляў і свецкіх прыёмаў гучала цудоўная музыка ў выкананні прафесійных музыкантаў (французскія, польскія, рускія танцы), ішлі прадстаўленні прыдворных тэатральных труп (камедыя ў замку ў Гродне, згаданая С.Незабітоўскім), магістрат таксама пачаў праводзіць сустрэчы з ганаровымі жыхарамі горада, падчас якіх спецыяльна запрошаныя школяры выконвалі дыялогі на польскай мове (дыялог з нагоды сустрэчы камісараў, Магілёў, 1699 г.) ці прадстаўлялі інтэрмедыі. Услед за магнатэрыяй, якая з канца XVI ст. пачынае ў адпаведнасці з распаўсюджанай сярод арыстакратычнай эліты заходнееўрапейскай модай калекцыяніраваць прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, антычныя, экзатычныя і рарытэтныя рэчы (с вызначэннем іх мастацкай каштоўнасці ў антыквараў – ацэнка "рэчы срэбнай" Янушам Радзівілам), зборам твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пачынаюць займацца і заможныя слаі іншых гарадскіх саслоўяў – духавенства, купцы, мяшчане, рамеснікі. З другой паловы XVIст. жыхары гарадоў абодвух тыпаў набываюць рэчы з каштоўных металаў



(срэбра) – келіхі, пацíры, чашы (пацір у выглядзе Купідона, чаша з выгравіраванымі выявамі біблейскіх падзей), а з XVII ст. збіраюць фігуры міфалагічных персанажаў, жывёл і раслін, габелены, выявы святых (іконы, апраўленыя ў срэбра, італьянскія іконы "на палатне"). У сярэдзіне XVII ст. бессістэмнае назапашванне каштоўнасцей – з боку прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя – змяняецца мэтанакіраваным фарміраваннем імі прыватнаўласніцкіх мастацкіх калекцый, у склад якіх уваходзяць палотны вядомых заходнееўрапейскіх мастакоў (Л.Кранаха, А.Дзюрэра), а таксама партрэтных галерэй, дзе сустракаюцца ўжо і творы, выкананыя мясцовымі майстрамі (прыдворнага мастака К.Цаллота). Мецэнацкая дзейнасць магнатэрыі (з XVII ст.) у галіне развіцця выяўленчага мастацтва звязана з апекваннем ёю айчынных творцаў (Ежы Стока і інш.) і патранатам прафесійнай мастацкай школы. Распаўсюдзілася хатняе бытавое інструментальнае музіцыраванне – спачатку сярод магнатэрыі (каралева Бона Сфорца грала на розных музычных інструментах, мінскі ваявода Крыштаф Завіша валодаў лютняй), а потым і сярод жыхароў іншых саслоўяў у гарадах абодвух тыпаў (у Полацку – з канца XVI ст., у Нясвіжы – з 1613 г.). Гараджане пачалі захапляцца хатнім вакальным выканальніцтвам: у музычную сферу ўласна-побытавага мастацкага жыцця гараджан к сярэдзіне XVII ст. трывала ўвайшлі не толькі заходнееўрапейскія гімны ("Te Deum Laudamus"), але і мясцовыя канты, псальмы на польскай і беларускай мове ("Неба і зямля ныне святкуюць"), якія сталі неад'емнай часткай гарадскога музычнага быту. З другой паловы XVII ст. назіраецца цікавасць гараджан усіх саслоўяў да тэатральнага мастацтва: падчас прыватных прыёмаў, земскіх судоў, сеймікаў для забавы прысутных гучаць "дыялогі" на польскай мове, прадстаўленыя навучэнцамі (дыялог у Оршы, 1697 г.).

*3.1.4 "Асаблівасці мастацкага жыцця ў гарадах Беларусі"* абодвух тыпаў праяўляліся ў залежнасці ад падпарадкаванасці горада магнату або каралю і ад існуючай рэлігійнай сітуацыі, што абумоўлівала распаўсюджанне пэўнага віда (мастацкага жыцця) ці дамінаванне адной з яго форм (музычных, мастацкіх, тэатральных). У гарадах (абодвух тыпаў), дзе панаваў езуіцкі ордэн, пад патранатам якога знаходзіліся калегіумы, агульнагарадское і рэпрэзентатыўнае мастацкае жыццё гараджан фарміравалася пад уздзеяннем тэатральных традыцый, а спектаклі, што ставіліся на школьнай сцэне ў касцёлах, станавіліся агульнагарадской славутасцю (Нясвіж, Полацк, Пінск). У прыватнаўласніцкіх гарадах (Слуцк, Нясвіж) аддавалася перавага пастаноўкам п'ес і панегірыкаў свецкага характару ў гонар магната (якія ўваходзяць у знойдзены аўтарам рукапіс "Editiones panegyricae patrum Societatis Jesu"), а таксама камедыям (камедыя ў слуцкай школе, згаданая С.Незабітоўскім, 1696г.). У каралеўскіх гарадах, наадварот, пастаноўкі часцей за ўсё насілі рэлігійны характар і ставіліся пераважна ў дні царкоўных свят (Навагрудак, драма пасійна на польскай і рускай мове ў касцёле, 1637 г.). Паказы ажыццяўляліся і ў сцэнах земскіх судоў ці гарадскіх памяшканняў, дзе праходзілі сеймы (прадстаўленне трагедыі падчас земскага суда ў Полацку, 1641 г.). Важнай падзеяй мастацкага жыцця



Репозиторий БГУКИ

прыватнаўласніцкіх гарадоў апошняй трэці XVI ст. становіцца з'яўленне першага прафесійнага тэатра: з 1573 г. у рэзідэнцыі Радзівіла дзейнічала тэатральная трупа, у склад якой уваходзілі італьянскія акцёры (аб чым маецца запіс у дзённіку Г. Вольфа, хатняга настаўніка з Цюрыха). На працягу XVII ст. рэпертуар прафесійнага тэатра ўзбагачаўся. У ім ставіліся камедыі на італьянскай мове (увайшлі у рукапісны зборнік "Opery i komedye rożne po włosku" сярэдзіны XVII ст., знойдзены аўтарам у архіве Радзівілаў у Варшаве).

Мастацкае жыццё ў каралеўскіх гарадах на ўсходзе Беларусі (Магілёў), альбо ў прыватнаўласніцкіх гарадах, магнат-уладар якога прытрымліваўся праваслаўнага веравызнання (Супрасль), адбывалася ў адпаведнасці са старажытнымі канонамі, таму ў афармленні агульнагарадскіх мерапрыемстваў дамінавала музыка. Цырымоніі ўзбагачаліся шматгалосымі партэснымі спевамі, якія засноўваліся на эфекце "арганнага гучання" (Супрасль). Асаблівасцю арганізацыі рэлігійных (праваслаўных, каталіцкіх), а таксама свецкіх шэсцяў, аздобленых музыкай, заключалася і ў тым, што ў іх абавязкова прымалі ўдзел спевакі праваслаўнага брацтва (удзел брацкіх спевакоў у свяце Божага Цела, Магілёў, канец XVII ст.). Устойлівасць існуючых традыцый не дазваляла прыняць тэатралізаваныя формы афармлення афіцыйнай часткі агульнагарадскога свята, нават тых праваслаўных абрадаў ("амавенне ног", "хаджэнне на асляці"), у якіх звычайна выкарыстоўваліся элементы тэатралізацыі (Магілёў). У мастацкім жыцці памежных ці гандлёвых гарадоў каралеўскага падпарадкавання (Віцебск, Полацк) пераважае ўласна-побытавы яго від і адна з форм – калекцыяніраванне прадметаў мастацтва (набыццё купцамі, заможнымі мяшчанамі габеленаў, карцін, фарбаваных ікон).

***У раздзеле 3.2 "Роля саслоўных груп і іх асобных прадстаўнікоў у арганізацыі мастацкага жыцця гарадоў Беларусі і Расіі"*** адзначаецца пэўныя функцыі і ўклад кожнага з саслоўяў у развіццё мастацкага жыцця. У прыватнаўласніцкіх гарадах асноўным арганізатарам і патранатам калектыўных агульнагарадскіх і рэпрэзентатыўных мерапрыемстваў з'яўляўся магнат, духавенства адказвала за правядзенне афіцыйнай часткі цырымоніі (рэлігійнай ці свецкай) – арганізоўвала шэсце, адпраўляла набажэнства, сачыла за якасным тэатралізаваным, музычным і дэкаратыўным афармленнем (цырымоніі). Вучні калегіумаў, брацкіх школ, бурсаў, музыканты касцёльнай і магнацкай капэлы і акцёры (тэатральныя трупы акцёраў караля Уладзіслава, Радзівілаў) былі галоўнымі выканаўцамі. Астатняя частка гараджан прымала ўдзел у шэсцях або з'яўлялася гледачамі ўрачыстасці. У гарадах каралеўскага падпарадкавання арганізатарамі агульнагарадскіх цырымоній выступалі магістрат і духавенства. Галоўнымі выканаўцамі ў гарадскіх мерапрыемствах лічыліся вучні навучальных устаноў, яны ўдзельнічалі ў тэатралізаваных паказах, разам з царкоўнымі харавымі і інструментальнымі капэламі спявалі і ігралі на музычных інструментах (Вільня, кананізацыя каралевіча, 1604 г.). Прадстаўнікі цэхавых і купецкіх карпарацый, брацтваў абавязваліся быць удзельнікамі



агульнагарадскіх шэсцяў, з'яўляліся пасіўнымі выканаўцамі гімнаў, псальмаў, песнапенняў: у адрозненні ад жыхароў заходнееўрапейскіх гарадоў іх функцыі былі больш сціплымі. У рэпрэзентатыўных гарадскіх цырымоніях удзел прымала толькі пэўная частка насельніцтва: у прыватнаўласніцкіх горадах – магнацкія харугвы з ваеннымі музыкантамі, у каралеўскіх – ваеннаабавязаныя гараджане. Астатняе насельніцтва выступала ў якасці гледачоў. Магнатэрыя ці магістрат (у залежнасці ад тыпу горада) з'яўляліся арганізатарамі мерапрыемстваў (Слуцк, "Статут стралковых спаборніцтваў", 1621 г.).

Вялікую ролю ў развіцці мастацкага жыцця гарадоў абодвух тыпаў адыгрывала духавенства розных канфесій, а таксама навучэнцы. Дзякуючы творчай дзейнасці прадстаўнікоў духоўнага сану рэлігійныя агульнагарадскія цырымоніі ўзбагачаліся гучаннем новых інструментальных ці складаных харавых шматгалосых твораў (Ц. Жахоўскага, Св. Язафата), а асноўнымі выканаўцамі псальмаў, дыялогаў, інтэрмедый падчас агульнагарадскіх святаў з'яўляліся навучэнцы.

Прадстаўнікі беларускага грамадства аказалі значны ўплыў на развіццё мастацкай культуры Расійскай дзяржавы XVII ст. Беларускія музыканты і "вспевакі" – С. Гутоўскі, К. Васілеўскі і інш. – працавалі ў дамах прывілеіраваных расіян, навучалі музычнаму майстэрству. А. Мезенец, М. Дылецкі дзейнічалі ў цэрквах, садзейнічалі развіццю харавога выканальніцтва, музычнай адукацыі. Беларусы паспрыялі ўзнікненню прыдворнага тэатра цара Аляксея Міхайлавіча: С.Полацкі пісаў п'есы для гэтага тэатра, а яго суайчыннікі – жыхары Новамяшчанскай слабады – прымалі ўдзел у першых тэатральных пастаноўках ("Камедыя аб Бахусе").

***У раздзеле 3.3 "Мастацкае жыццё гарадоў Беларусі як гісторыка-культурная з'ява"*** мастацкае жыццё прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. прадстаўлена як пэўная культурная з'ява. Агульнагарадскі, рэпрэзентатыўны, уласна-побытавы віды мастацкага жыцця, якія ўсталяваліся на беларускіх землях, па-першае, адлюстроўвалі тыя іманентныя працэсы, што адбываліся ў мастацтве адзначанага перыяду. Па-другое, аналіз розных форм мастацкага жыцця, якія панавалі ў прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадах Беларусі, дазволіў выявіць тэндэнцыі развіцця музычнага, тэатральнага, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў у грамадскім і побытавым жыцці гараджан. Унікальная поліканфесійная сітуацыя, што склалася на тэрыторыі Беларусі ў гэты перыяд, акрэсліла тэндэнцыі развіцця музычнага мастацтва: дзейнасць прадстаўнікоў каталіцкай рэлігіі аказалася вызначальнай для распаўсюджання заходніх форм абрадавасці і заходнееўрапейскіх музычных традыцый; супрацьстаянне праваслаўнай царквы каталіцкім уплывам прывяло да ўзбагачэння праваслаўнага богаслужэння партэсным шматгалоссем. Музычнае мастацтва паступова секулярызавалася, што абумовіла распаўсюджанне ў гарадскім асяроддзі рэлігійных песень-гімнаў (псальмаў), бытавых песень (кантаў), а таксама хатняга бытавога музіцыравання. Музычнымі нумарамі аздабляліся школьныя спектаклі. Дзейнасць адукаваных



Репозиторий БГУКИ

спевакоў і інструменталістаў (у свецкіх інструментальных і харавых капэлах, царкоўных капэлах і хорах) спрыяла станаўленню пэўных канонаў музычнага выканальніцтва (аб чым сведчаць водгукі і ўражанні Дж.Гарзея, англельскага пасла; запісы ананімнага прыдворнага інфарматара; правілы спявання, прапісаныя ў Статуце брыгітак; усталяваная манера выканання партэсных спеваў).

Тэатральнае мастацтва, што развівалася ў межах агульнагарадскога, рэпрэзентатыўнага, уласна-побытавага відаў мастацкага жыцця ў гарадах Беларусі абодвух тыпаў, пэўна трансфармавалася. Публічныя спектаклі (рэлігійныя драмы) і тэатралізаваныя прадстаўленні (“відовішчы”) навучэнцаў, якія спачатку былі накіраваны на ўзмацненне рэлігійнага настрою прыхаджан, з цягам часу пачалі выконваць грамадскую функцыю, што праявілася ў паказах трагедый, прадстаўленнях “дыялогаў” падчас земскіх судоў, сеймаў, у адлюстраванні (у спектаклях) актуальных падзей. Тэатралізаваныя відовішчы ва ўласных рэзідэнцыях магнатаў (Радзівілаў), якія ставіліся сіламі замежных прафесійных акцёраў, засноўваліся на традыцыях заходнееўрапейскага тэатра і насілі свецкі характар (што пацвярджаецца знойдзеным аўтарам рукапісным зборнікам камедый і так званых “опер” – п’ес, багата аздобленых музычнымі нумарамі). Прыведзеныя архіўныя крыніцы – дзённік Г.Вольфа, зборнік п’ес, ускосныя звесткі аб дзейнасці ў рэзідэнцыі Радзівілаў італьянскіх акцёраў – даюць падставу сцвярджаць, што менавіта ў апошняй трэці XVI ст. закладваюцца асновы для ўзнікнення будучага знакамітага прыватнаўласніцкага тэатра XVIII ст.

Дэкаратыўна-прыкладное і выяўленчае мастацтва таксама развіваецца ў рэчышчы мастацкага жыцця тагачаснага грамадства. На працягу XVI –XVII стст. гараджане фарміруюць асабістыя зборы, у якія ўключаюць каштоўнасці, прадметы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – ад традыцыйных келіхаў, чашаў, ікон да модных рэчаў і прадметаў інтэр’еру – габеленаў, карцін, гадзіннікаў. Аналіз мастацкіх збораў тагачаснага перыяду дазваляе прасачыць працэс секулярызацыі выяўленчага мастацтва, якое паступова страчвае культавае прызначэнне: прадстаўнікі ўсіх саслоўяў імкнуцца здабыць модныя ў той час фарбаваныя іконы “на палатне”, сцены дамоў і сядзібаў упрыгожваюць карцінамі на свецкія сюжэты. Перыяд XVI – XVII стст. адзначаны і мэтанакіраваным збіраннем арыстакратычнай элітай прадметаў мастацтва, фарміраваннем прыватнаўласніцкіх калекцый, карцінных і партрэтных галерэй. Менавіта ў магнацкіх рэзідэнцыях (Радзівілаў, Сапегаў) закладваюцца першыя мастацкія зборы, якія пры спрыяльных умовах маглі б стаць асновай нацыянальных публічных музеяў.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Характар мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. залежаў ад тыпу горада – прыватнаўласніцкага (Слуцк, Нясвіж, Ружаны, Шклоў, Супрасль) ці каралеўскага (Магілёў, Віцебск, Мінск, Навагрудак), а таксама ад яго



месцазнаходжання – гандлёвы (Брэст), памежны (Орша). На характар мастацкага жыцця аказвала ўздзеянне палітычная, грамадска-сацыяльная і рэлігійная сітуацыя ў краіне (дзяржаўны лад, саслоўная іерархія, поліканфесійнасць – суіснаванне розных, у тым ліку і нехрысціянскіх канфесій). Мастацкае жыццё (агульнагарадскі, рэпрэзентатыўны і ўласна-побытавы яго віды) большасці *прыватнаўласніцкіх гарадоў* фарміравалася пад уздзеяннем заходнееўрапейскіх культурных дасягненняў, характэрных для эпохі барока. У калектыўных агульнагарадскіх рэлігійных і свецкіх цырымоніях выкарыстоўваліся элементы паратэатральнай культуры, выконваліся рэлігійныя і свецкія музычныя творы, багата дэкарыраваліся вуліцы, якія аздабляліся скульптурамі, партрэтамі магната, эмблемамі яго роду (шэсце ў Нясвіжы, 1640 г.). Рэпрэзентатыўныя цырымоніі дзяржаўнай значнасці праходзілі з удзелам выключна прадстаўнікоў арыстакратыі, іх харугваў і ваенных капэл (парад у Варшаве, 1646 г.); пахавальныя цырымоніі магнатаў абавязкова тэатралізаваліся і дэкарыраваліся ваеннай атрыбутыкай, пераўвасабляючыся ў своеасаблівы “жалобны спектакль” (пахаванне Крыштофа Радзівіла, 1640 г.). Ва ўласна-побытавы від мастацкага жыцця ўваходзілі такія формы, як пышныя свецкія балі і прыёмы, багата аздобленыя музыкай у выкананні прафесійных капэл і прадстаўленнямі прыватнаўласніцкага тэатра (“Літоўская капэла” у Гродна; тэатральная трупа Радзівіла); бытавое хатняе музіцыраванне (А. Радзівіл граў на аргане); калекцыяніраванне твораў мастацтва, рарытэтаў, жывапісных палотнаў, партрэтаў у асабістых карцінных галерэях (у Радзівілаў, Сапегаў). Сярод прадстаўнікоў іншых саслоўных груп распаўсюдзілася побытавае музіцыраванне, асабістае збіранне каштоўных рэчаў, ікон, кніг, мода на сумесныя забаўляльныя вечарыны з праслухоўваннем “дыялогаў”, панегірыкаў, праглядам школьных спектакляў (Навагрудак, Полацк). У агульнагарадскім мастацкім жыцці большасці *каралеўскіх гарадоў* панавалі мясцовыя традыцыі, а заходнееўрапейскія новаўвядзенні пераймаліся марудна і толькі праз пэўны час ужываліся ў адаптаваным выглядзе. Тут пераважалі рэлігійныя па характару цырымоніі – шэсці духавенства, гарадскіх цэхавых карпарацый рамеснікаў з асабістымі эмблемамі, зброяй і інструментамі, багата аздобленыя музыкай, – у залежнасці ад пануючай у горадзе канфесіі вакальнай ці інструментальнай (Магілёў, святкаванне Пасхі, 1697 г.). Рэпрэзентатыўныя мерапрыемствы праводзіліся ў форме ваенных парадаў ваеннаабавязаных гараджан, стралковых збораў (Магілёў, 1697 г.). Уласна-побытавае жыццё жыхароў уключала бытавое музіцыраванне (ігру на лютні, трубах), хатняе вакальнае выканальніцтва (гімнаў, кантаў, псальмаў), збіранне прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (пацір, чаш, кубкаў, фігурак), ікон, кніг [10; 12; 14].

2. Мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. цалкам залежала ад знешніх (вайна 1654 – 1667 гг. замарудзіла развіццё калектыўных відаў мастацкага жыцця амаль на два дзесяцігоддзі) і ўнутраных фактараў (секулярызацыйныя працэсы паўплывалі на характар мастацкага жыцця ў бок яго абміршчэння, у першую чаргу ў



Рэпазіторый БДУКіМ

прыватнаўласніцкіх гарадах Нясвіж, Слуцк), што і вызначыла дынаміку яго (мастацкага жыцця) развіцця. Агульнагарадскія цырымоніі ў гарадах абодвух тыпаў арганізоўваюцца: у XVI ст. – па традыцыі, як рэлігійныя ўрачыстасці (шэсці, адпраўленне багаслужэння), з другой паловы стагоддзя праходзяць з удзелам свецкіх капэл (у прыватнаўласніцкіх гарадах), у 30 – 40-я гг. XVII ст. у афармленні агульнагарадскіх мерапрыемстваў дамінуюць свецкія элементы (гучаць канты, прывітальныя гімны, ставяцца камедыі, наладжваюцца феерверкі, брамы ўпрыгожваюцца накшталт трыумфальных арак і інш.), але ў каралеўскіх гарадах цырымоніі часткова носяць яшчэ рэлігійны характар; з 70-х гг. XVII ст. дзейнічае ўсталяваны сцэнарый калектыўных свят (шэсці гараджан у адпаведнасці з саслоўнай іерархіяй, суправаджэнне мерапрыемстваў музыкай, гарматнымі салютамі, святочнае дэкарыраванне вуліц). Дынаміку развіцця рэпрэзентатыўнага віду мастацкага жыцця гарадоў абодвух тыпаў вызначала: увядзенне ў цырымонію з канца XVI – XVII стст. элементаў заходнееўрапейскай парагэатральнай культуры (касцюміраванне, багатае дэкарыраванне свята, пераўвасабленне акцёраў у пэўную асобу – пахавальныя цырымоніі); распрацоўка пратаколу арганізацыі і правядзення рэпрэзентатыўных мерапрыемстваў. Ва ўласна-побытавым мастацкім жыцці на працягу XVI (у прыватнаўласніцкіх гарадах) і XVII стст. (у гарадах каралеўскага падпарадкавання) распаўсюджваецца бытавое музіцыраванне (інструментальнае, вакальнае); у магнацкіх рэзідэнцыях і ў дамах заможных мяшчан, купцоў, духавенства фарміруюцца першыя калекцыі прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва (з XVI ст. – пацір, ікон; з XVII ст. – габеленаў, карцін, друкаваных кніг); у арыстакратычных сядзібах з XVII ст. з'яўляюцца першыя карцінныя галерэі, сістэматызаваныя музейныя зборы (карцінная галерэя Радзівілаў, Нясвіж). Магнатэрыя з канца XVI ст. бавіць дасуг тэатральнымі пастаноўкамі (камедыямі і пастаралямі з танцамі і спевамі – "Дон Пэдра д'Арагон", сяр. XVII ст.) [3; 11; 13; 16].

3. Мастацкае жыццё прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. мела свае асаблівасці і складвалася ў залежнасці ад існуючых гарадскіх традыцый. Гэта абумоўлівала дамінаванне пэўнага віду мастацкага жыцця – агульнагарадскога, рэпрэзентатыўнага (як у прыватнаўласніцкіх гарадах), уласна-побытавага (як у гандлёвых каралеўскіх гарадах), ці пераважання адной з форм (тэатральных, музычных, мастацкіх) аздаблення мастацкага жыцця ў гарадскіх умовах. У прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадах, дзе існавалі заснаваныя ордэнам езуітаў калегіумы, агульнагарадскія мерапрыемствы арганізоўваліся як грандыёзныя тэатралізаваныя прадстаўленні (Навагрудак, Полацк). У сваю чаргу ў тых гарадах (абодвух тыпаў), дзе праваслаўная канфесія дамінавала і захоўваліся старажытныя праваслаўныя традыцыі, калектыўныя мерапрыемствы пераўтвараліся ў грамадскія канцэрты, дзе гучалі харавыя, у тым ліку шматгалосыя партэсныя музычныя творы (Супрасль, Магілёў). У гандлёвых і памежных гарадах каралеўскага падпарадкавання (Віцебск, Полацк, Брэст) развіваўся пераважна ўласна-побытавы від мастацкага



жыцця, у першую чаргу – калекцыяніраванне. Асаблівасцю мастацкага жыцця ў прыватнаўласніцкім горадзе (Нясвіж) і ў каралеўскай рэзідэнцыі (Гродна, Вільня) стала стварэнне і ўтрыманне прыватнаўласніцкага тэатра са стацыянарнай італьянскай трупай (тэатральная трупа Радзівілаў, Нясвіж; каралеўская трупа, Гродна) і усталяваным рэпертуарам, які складаўся з так званых "опер" і камедый [2; 5; 15].

4. Роля кожнага з саслоўяў у мастацкім жыцці гарадоў абодвух тыпаў была разнастайнай і насіла актыўны (арганізатары, удзельнікі і выканаўцы) і пасіўны (гледачы) характар. У прыватнаўласніцкіх гарадах асноўным арганізатарам калектыўных агульнагарадскіх і рэпрэзентатыўных свецкіх цырымоній з'яўляўся магнат, удзельнікамі – духавенства, якое адказвала за правядзенне афіцыйнай часткі (свята), галоўнымі выканаўцамі, згодна сцэнарыю – прафесійныя музыканты прыватнаўласніцкіх капэл (у Нясвіжы – і акцёры тэатральнай трупы), а таксама навучэнцы (шэсце з нагоды кананізацыі каралевіча Казіміра, Вільня, 1604 г.; цырымонія святкавання стагоддзя Ісусава таварыства, Полацк, 1640 г.). Пасіўнымі ўдзельнікамі аказваліся гараджане (мяшчане, рамеснікі). У гарадах каралеўскага падпарадкавання ініцыятарамі правядзення агульнагарадскіх і рэпрэзентатыўных цырымоній і іх арганізатарамі выступалі магістрат і духавенства, роля ўдзельнікаў і выканаўцаў аддавалася вучням, прадстаўнікі ж цэхавых карпарацый, брацтваў, купецкіх аб'яднанняў удзельнічалі ў шэсцях і сачылі за імі (Мінск, сустрэча М.Агінскага, 1689); у рэпрэзентатыўных цырымоніях у гарадах абодвух тыпаў, згодна з пратаколам, удзельнічала пэўная частка гарадскога насельніцтва – харугва магната з ваеннай музыкай (у прыватнаўласніцкіх гарадах) і ваеннаабавязаныя гараджане (у гарадах каралеўскага падпарадкавання), магнатэрыя ці магістрат (у залежнасці ад тыпу горада) арганізоўвалі шэсці ці парады; астатнія саслоўі і групы выконвалі пасіўныя функцыі гледачоў. Музычнае афармленне калектыўных мерапрыемстваў арганізоўвала духавенства, асобныя прадстаўнікі якога выступалі стваральнікамі музычных твораў (біскуп полацкі Ц.Жахоўскі). Роля навучэнцаў заключалася ў распаўсюджванні імі сярод простых гараджан культурных здабыткаў, перш за ўсё ў галіне тэатральнага мастацтва – "дыялогаў", панегірыкаў, што чыталіся на вуліцах горада і ў гарадскіх збудаваннях (у Мінску, Магілёве – у купецкіх дамах, карчмах), паказ інтэрмедый на кірмашах (інтэрмедыя "Цімон Гардзілюд" і інш. у Оршы, Навагрудку). Беларуская інтэлектуальная эліта аказала значны ўплыў на развіццё мастацкай культуры Расійскай дзяржавы XVII ст. Беларускія музыканты і "вспеваки" – С.Гутоўскі, К.Васілеўскі, Д.Рагачэўскі займаліся хатнім музычным выхаваннем; А.Мезенец, М.Дылецкі, працуючы пры цэрквах, садзейнічалі развіццю харавога выканальніцтва і музычнай адукацыі. Выхадзец з Беларусі С.Полацкі паспрыяў станаўленню (у 1672 г.) прыдворнага тэатра цара Аляксея Міхайлавіча, для якога стварыў п'есы ("Трагедыя аб Наўхданосары"); беларускія акцёры з Новамяшчанскай слабады (26 хлопцаў) былі першымі ўдзельнікамі тэатральных пастановак ("Камедыя аб Бахусе") [1; 6; 9].

БІБЛІЯТЭКА
... дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
Інв. № 814



Репозиторий БГУКИ

5 Мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. прадстаўляе сабой значную культурную з'яву: у гэты час у гарадах абодвух тыпаў усталяваліся пэўныя віды мастацкага жыцця (агульнагарадскі, рэпрэзентатыўны, уласна-побытавы); сфарміраваўся прыватнаўласніцкі тэатр з прафесійнай трупай італьянскіх акцёраў і ўстойлівым рэпертуарам (які складаўся з п'ес, змешчаных у рукапісу невядомага аўтара "Opery i komedye różne po włosku" , другая палова XVII ст.); вызначыліся пэўныя каноны музычнага выканальніцтва ("арганнае гучанне", мяккая манера ігры і г.д.); былі закладзены асновы для стварэння музейных збораў, фарміравання карцінных і партрэтных галерэй (залы рэзідэнцый Нясвіжа, Ружан); усталявалася пэўная мадэль правядзення калектыўных агульнагарадскіх і рэпрэзентатыўных урачыстых цырымоній, падчас якіх горад станавіўся адзінай тэатральна-музычнай і мастацкай пляцоўкай, на якой адбывалася далучэнне ўсіх слаёў насельніцтва да мастацтва; распаўсюдзілася (з сярэдзіны XVI ст.) мецэнацтва сярод вышэйшай арыстакратыі, што выразілася ў апекванні мясцовых мастакоў (Е.Сток) і музыкантаў (В.Длугарай, В.Шаматульскі) і садзейнічала развіццю прафесійнай мастацкай і музычнай школ. Менавіта росквіт мастацкага жыцця XVI –XVII стст. абумовіў усплёск мастацкай культуры ў наступным – XVIII – стагоддзі, што характарызавалася дзейнасцю прыватнаўласніцкіх тэатраў; з'яўленнем буйных музычных форм – оперы, харавога канцэрта; узнікненнем музейных збораў [4; 7; 8].

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню дысертацыі**

Матэрыялы і вынікі даследавання выкарыстоўваюцца ў аўтарскім вучэбным курсе "Тэатралізацыя святочнага і паўсядзённага жыцця беларускіх гараджан у XVI – XVII стст.", які чытаецца студэнтам 5 курса спецыялізацыі "тэатральная творчасць" УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (Акт укаранення ад 24 студзеня 2007 г.).

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе ў курсах лекцый па гісторыі музычнага, тэатральнага, выяўленчага мастацтва, гісторыі культуры Беларусі, курсе па выбары "Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў у старажытнай Беларусі", знайсці адлюстраванне пры падрыхтоўцы вучэбных праграм, навукова-метадычных дапаможнікаў.

Навуковыя палажэнні і высновы дысертацыйнага даследавання могуць стаць асновай для далейшых навуковых пошукаў у айчынным мастацтвазнаўстве, тэарэтычнай базай для распрацоўкі навуковых праектаў, накіраваных на пашырэнне ведаў аб мастацкай спадчыне Беларусі.



## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

**Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных часопісах**


1. Персидская, Ю.Д. Влияние Беларуси на развитие театрального и музыкального образования Московской Руси / Ю.Д. Персидская // Музычнае і тэатральнае мастацтва : праблемы выкладання. – 2004. – № 3.– С. 30 –33.

2. Пярсідская, Ю.Д. Роля езуіцкіх калегій у выхаванні духоўнай асобы на Беларусі ў XVI – XVII стст. / Ю.Д. Пярсідская // Музычнае і тэатральнае мастацтва : праблемы выкладання. – 2005. – № 2. – С. 26 – 27.

3. Пярсідская, Ю.Д. Магнацкія сядзібы як цэнтры развіцця свецкага прафесійнага мастацтва на Беларусі (XVI – XVII стст.) : гісторыка-кампаратывісцкая рэканструкцыя / Ю.Д. Пярсідская // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.– 2006. – № 6. – С. 141 – 146.


**Навуковыя зборнікі**


4. Пярсідская, Ю.Д. Паратэатральныя відовішчы як передумова ўзнікнення тэатральнага мастацтва на тэрыторыі старажытнай Беларусі / Ю.Д. Пярсідская // Сучасны беларускі тэатр : праблемы развіцця. – Мінск, 2006. – С. 14 – 16. – Бел. – Дэп. у ДУ "БелІСА" 20.04.06, № Д200631.

5. Пярсідская, Ю.Д. Школьны тэатр на беларускіх землях / Ю.Д. Пярсідская // Сучасны беларускі тэатр : праблемы развіцця. – Мінск, 2006. – С. 30 – 31. – Бел. – Дэп. у ДУ "БелІСА" 20.04.06, № Д200631.

6. Пярсідская, Ю.Д. Асаблівасці развіцця музычнага і тэатральнага мастацтва Беларусі ў XVI – XVII стст. (на прыкладзе мастацкага жыцця арыстакратыі) / Ю.Д. Пярсідская // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск: Права і эканоміка, 2007. – Вып. 2.– С. 256 – 260.


**Матэрыялы навуковых канферэнцый**


7. Пярсідская, Ю.Д. Навучальныя ўстановы Беларусі XVI – XVII стст.: асаблівасці школьнага ўкладу / Ю.Д. Пярсідская // Нацыянальная спадчына і сучасныя праблемы культуры (прысвячаецца 60-годдзю вызвалення Беларусі) : дакл., прачыт. на XXIX вынік. навук. канф. аспірантаў БДУ культуры і мастацтваў, Мінск, 22 – 23 красав. 2004 г. / Бел. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2004. – С. 238 – 245. – Бел. – Дэп. у ДУ "БелІСА" 30.06.04, № Д200469.

8. Пярсідская, Ю.Д. Калекцыяніраванне ў старажытнай Беларусі як адна з формаў захавання айчыннай культурна-гістарычнай спадчыны / Ю.Д. Пярсідская // II Няфёдаўскія чытанні : матэрыялы навук. канф., Мінск, 24 – 25 сак. 2005 г. / Бел. дзярж. акад. мастацтваў. – Мінск, 2005. – С. 153 – 156.

9. Пярсідская, Ю.Д. Магнацкія сядзібы як культурна-асветніцкія цэнтры Беларусі XVI – XVII стст. / Ю.Д. Пярсідская // Социально-психологические и гуманитарные аспекты интеграции культур в условиях трансформации современного


Репозиторий БГУКИ

общества : материалы междунар. науч.-практ. конф. студ. и молодых учёных, Витебск, 10 нояб. 2005 г. – Витебск: УО "ВГУ им. П.М.Машерова", 2005. – С. 69 – 70.

10. Пярсідская, Ю.Д. Рэпертуар школьных тэатраў Беларусі як умова фарміравання патрыятычных якасцей навучэнцаў XVI – XVII стст. / Ю.Д. Пярсідская // Каштоўнасці нацыянальнай культуры і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі (прысвячаецца 60-годдзю вызвалення Беларусі) : дакл., прачыт. на XXX вынік. навук. канф. аспірантаў БДУ культуры і мастацтваў, Мінск, 20 – 21 красав. 2005 г. / Бел. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2005. – С. 192 – 196. - Бел. – Дэп. у ДУ "БелІСА" 04.01.2007, № Д20073.

11. Пярсідская, Ю.Д. Урачыстыя цырымоніі як адна з перадумоў станаўлення тэатральнага мастацтва Беларусі XVI – XVII стст. / Ю.Д. Пярсідская // X Міжнародныя Кірыла-Мефодзіеўскія чытанні : матэрыялы навук. канф., Мінск, 24 – 26 мая 2004 г. / Бел. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2005. – С. 121 – 125.

12. Пярсідская, Ю.Д. Школьны тэатр на Беларусі ў XVI – XVII стст. і яго роля ў фарміраванні тэатральнага мастацтва Маскоўскай Русі / Ю.Д. Пярсідская // Международная научно-практическая конференция молодых исследователей : материалы конф., Барановичи, 22 февр. 2005 г. – Барановичи: УО "БарГУ", 2005. – С. 224 – 226.

13. Пярсідская, Ю.Д. Сувязі беларускага школьнага тэатра з усходнееўрапейскай тэатральнай культурай (XVI – XVII стст.) / Ю.Д. Пярсідская // XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы навук. канф., Мінск, 24 мая 2005г. / Бел. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2006. – С. 110 – 113.

**Тэзісы дакладаў навуковых канферэнцый**

14. Пярсідская, Ю.Д. Паратэатральныя дзействы як адлюстраванне дзяржаўнага ладу жыцця свецкага грамадства XVI – XVII стст. у Беларусі / Ю.Д. Пярсідская // Духоўная культура Беларусі : спадчына і сучаснасць : тэз. дакл. навук. канф., Мінск, 24 – 25 ліст. 2004 г. / Бел. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2004. – С. 16 – 18.

15. Пярсідская, Ю.Д. Паратэатральныя відовішчы як неад'емная частка жыцця беларускага грамадства XVI – XVII стст. / Ю.Д. Пярсідская // Культура і творчасць : сучасны стан і перспектывы : навук. канф., прысвеч. 30-годдзю БДУ культуры і мастацтваў : тэз. дакл., Мінск, 13 кастр. 2005 г. / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2005. – С. 14 – 16.

16. Пярсідская, Ю.Д. Тэатралізаваныя паказы ў богаслужэннях праваслаўнай і каталіцкай царквы на Беларусі XVI – XVII стст. і іх роля ў станаўленні айчыннага прафесійнага тэатра / Ю.Д. Пярсідская // Даклады, прачытаныя на XXXI выніковай навуковай канферэнцыі аспірантаў БДУ культуры і мастацтваў, Мінск, 21 красав. 2006 г. / Бел. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2006. – С. 109 – 113. – Бел. – Дэп. у ДУ "БелІСА", № Д20072.



**РЭЗЮМЭ**

**Пярсідская Юлія Дзмітрыеўна**
**Мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVI-XVII стст.**
**(мастацтвазнаўчая рэканструкцыя)**

Ключавыя словы: мастацкае жыццё гарадоў Беларусі, тэатральныя, музычныя, мастацкія формы, дзейнасць саслоўных груп, прафесійных школ, мецэнацтва.

Мэта дысертацыйнага даследавання – рэканструяваць панараму мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст., фарміраванне і дынаміка развіцця якога абумовіла росквіт мастацкай культуры ў наступным – XVIII – стагоддзі.

Метадалагічная база дысертацыі грунтуецца на комплексным, культуралагічным, сацыялагічным, сістэмным падыходах, метадзе параўнальнага аналізу, навуковых метадах сінтэзу і абагульнення, мастацка-аналітычнага і параўнальна-гістарычнага метадах, а таксама на ўніверсальным прынцыпе гістарызму.

Атрыманыя вынікі, іх навізна

Упершыню ў айчынным мастацтвазнаўстве зроблена мастацтвазнаўчая рэканструкцыя мастацкага жыцця прыватнаўласніцкіх і каралеўскіх гарадоў Беларусі ў адпаведнасці з існуючай у XVI – XVII стст. саслоўнай іерархіяй. Выяўлены характар і асаблівасці мастацкага жыцця абодвух тыпаў гарадоў Беларусі; раскрыта дынаміка яго развіцця; адзначаны ўклад кожнага з саслоўяў у арганізацыю мастацкага жыцця гарадоў Беларусі; вызначана месца мастацкага жыцця гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. у айчынным гісторыка-культурным працэсе. Навуковая навізна дысертацыйнага даследавання абумоўлена новым (комплексным) падыходам да вывучэння такой з'явы, як мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVI – XVII стст., што дазволіла, абапіраючыся на рукапісныя і друкаваныя архіўныя матэрыялы, вызначыць яе значнасць у развіцці культуры Беларусі XVI – XVII стст.

Рэкамендацыі па выкарыстанні

Атрыманыя ў выніку дысертацыйнага даследавання матэрыялы выкарыстоўваюцца пры чытанні вучэбнага аўтарскага курса "Тэатралізацыя святочнага і паўсядзённага жыцця беларускіх гараджан у XVI – XVII стст." (Акт укаранення ад 24 студзеня 2007 г.), а таксама могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы агульных курсаў па гісторыі музычнага, тэатральнага, выяўленчага мастацтва. Вынікі даследавання могуць знайсці адлюстраванне пры распрацоўцы вучэбных праграм, напісанні вучэбна-метадычных дапаможнікаў. Навуковыя палажэнні і высновы дысертацыі могуць стаць асновай для далейшых навуковых пошукаў у айчынным мастацтвазнаўстве.

Галіна выкарыстання: мастацтвазнаўства.



Репозиторий БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

**Персидская Юлия Дмитриевна**
**Художественная жизнь городов Беларуси XVI – XVII вв.**
**(искусствоведческая реконструкция)**

Ключевые слова: художественная жизнь городов Беларуси, театральные, музыкальные, художественные формы, деятельность сословных групп, профессиональных школ, меценатство.

Цель диссертационного исследования – реконструировать панораму художественной жизни городов Беларуси XVI – XVII вв., формирование и динамика развития которой обусловили расцвет художественной культуры в следующем – XVII веке.

Методологическая база диссертации основывается на комплексном, культурологическом, социологическом, системном подходах, на методе сравнительного анализа, синтеза и обобщения, художественно-аналитическом и сравнительно-историческом методах, а также универсальном принципе историзма.

Полученные результаты, их новизна

Впервые в отечественном искусствоведении представлена искусствоведческая реконструкция художественной жизни частновладельческих и королевских городов Беларуси в соответствии с существующей в XVI – XVII вв. сословной иерархией. Выявлен характер и особенности художественной жизни городов Беларуси обоих типов; уточнена динамика её развития; отмечен вклад каждого из сословий в организацию художественной жизни городов Беларуси; определена роль художественной жизни городов Беларуси XVI – XVII вв. в отечественном историко-культурном процессе. Научная новизна диссертационного исследования обусловлена новым (комплексным) подходом к изучению такого явления, как художественная жизнь городов Беларуси XVI – XVII вв., что позволило, опираясь на рукописные и печатные архивные материалы, выделить её значимость в развитии культуры Беларуси XVI – XVII вв.

Рекомендации по использованию

Полученные в результате диссертационного исследования материалы используются при чтении учебного авторского курса «Театрализация праздничной и повседневной жизни белорусских горожан у XVI – XVII вв.» (Акт укоренения от 24 января 2007 г.), а также могут быть использованы при подготовке общих курсов по истории музыкального, театрального, изобразительного искусства. Результаты исследования могут найти отражение при разработке учебных программ, написании учебно-методических пособий. Научные положения и выводы диссертации могут стать основой для дальнейших поисков в отечественном искусствоведении.

Область применения: искусствоведение





## SUMMARY

**Persidskaya Juliya Dmitrievna**
**Artistic life of Belarusian towns of XVI – XVII centuries**
**(Art reconstruction)**

Key words: artistic life of Belarusian towns, the theatre forms, the music forms, the arts forms, activity of class groups, professional schools, patronship of arts.

The dissertation research objective - reconstruction of artistic life of Belarusian towns of XVI – XVII centuries, formation and epigenetics of which conditioned cultural explosion of the following – XVIII – century.

The methodology of the dissertation is based on the complex, culturology, sociology and system approaches, methods of comparative analysis, scientific methods of synthesis and generalization, artistic analytical and comparative methods, as well as on the universal principle of historicism.

Findings and its novelty

For the first time in the frames of the domestic art history we have studied a problem of art reconstruction of artistic life of private and royal towns of Belarus according to the class hierarchy of XVI – XVII centuries. We have found out the nature and characteristics of artistic life in both types of towns, specified its pointed out the role of each classes's contribution to the organization of artistic life of Belarusian towns of XVI – XVII centuries in the historical and cultural process. Scientific novelty of the dissertation research is based on the new (complex) approach to learn the appearance of artistic life of Belarusian towns of XVI – XVII cncn., which allow, leaned against into the manuscript and print archives materials to mark its important in development of Belarusian culture of XVI – XVII centuries.

Recommendation for use

The materials received in the result of the thesis research are used while delivering the author's lecture course "Theatricalization of festal and everyday life of Belarusian town dwellers in XVI – XVII centuries" (BSUCA, act of insertion of 24 January 2007), and also can be used while preparation in general course in the history of musical, theatrical, fine art. The results of the research can be find an application while working out the educational programs, educational-methodic textbooks. Scientific tenets and conclusions of research could become the basis for the future searches in the native art history.

Sphere of use: art history




Репозиторий БГУКИ

*Навуковае выданне*

**Пярсідская Юлія Дзмітрыеўна**

**МАСТАЦКАЕ ЖЫЦЦЁ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ XVI – XVII стст.**
**(МАСТАЦТВАЗНАЎЧАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ)**

**Аўтарэферат**

дысертацыі на суіскание вучонай ступені
кандыдата мастацтвазнаўства

Падпісана ў друк 10.12. г. Фармат 60x84 1/16. Папера пісчая № 1.
Ум. друк. арк. 1,29. Ул.-выд. арк. 1,21. Заказ № 420. Тыраж 60 экз.

**Рызограф УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»**
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17

Репозиторий БГУКИ